# ЗЯРНЯТКА 22

4 лютага 2018 г. V Звычайная нядзеля, Год B

*Аздаравіў многіх, якія цярпелі на розныя хваробы* *Мк 1, 29—39*

Езус, выйшаўшы з сінагогі, прыйшоў з Якубам і Янам у дом Сымона і Андрэя. Цешча ж Сымона ляжала ў гарачцы, і адразу сказалі Езусу пра яе. Ён падышоў і, узяўшы за руку, падняў яе. І прайшла ў яе гарачка; і жанчына пачала служыць ім.

Калі ж настаў вечар і калі зайшло сонца, прыносілі да Яго ўсіх нядужых і апантаных злымі духамі. А ўвесь горад сабраўся перад дзвярыма. Ён жа аздаравіў многіх, якія цярпелі на розныя хваробы, і выгнаў многіх злых духаў; і не дазваляў злым духам казаць, што яны ведалі Яго. А раніцай, устаўшы вельмі рана, выйшаў і пайшоў у пустыннае месца і там маліўся. Сымон і тыя, хто быў разам з ім, пайшлі за Ім. І, калі знайшлі Яго, сказалі Яму: Усе шукаюць Цябе. Ён адказаў ім: Пойдзем куды-небудзь у бліжэйшыя мястэчкі, каб і там прапаведаваць, бо Я дзеля гэтага прыйшоў.

І прапаведаваў Ён у сінагогах іхніх па ўсёй Галілеі, і выганяў злых духаў.



*Гэта слова Пана.*

**Пане, Ты лечыш зламаныя сэрцы.**

# З ДАПАМОГАЮ ТЭЛЕФОНА ДАВЕДАЕШСЯ, ЯК ЗЛЫЯ ДУХІ НАЗЫВАЛІ ЕЗУСА

7-1 9-3 5-3   1-2 6-1 3-2 9-3, 7-1 1-3 2-3 7-3

3-3 1-2 1-1 1-3 4-1 8-3 2-3 5-1 0-1,

5-1 2-3 4-3 1-1 6-3   2-2 7-3 9-2 9-3




Як прачытаць код?
Першая лічба азначае ў якім коле знаходзіцца патрэбная літара. Другая лічба азначае якую літару трэба запісаць (напрыклад, 7-2 азначае “Т”, другую літару ў сёмым коле).

Малітва.
Пане Езу, мой Збавіцель і Пекар маёй душы, дзякую Табе за дар збаўлення, за Тваю бязмежную і ахвярную любоў. Навучы мяне любіць блізкіх і прабачаць усе крыўды. Амэн.